*К. В. Саўчук*
Навуковы кіраўнік — *В. М. Шавель*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

# РАЗВІЦЦЁ НАВЫКАЎ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ЭМАЦЫЯНАЛЬНА-ЭКСПРЭСІЎНАЙ ЛЕКСІКІ Ў ШКОЛЕ

Даследчыкі, якія займаюцца вывучэннем і абгрунтаваннем метадычных асноў канцэпцыі фарміравання крытычнага мыслення, сцвярджаюць, што ўсе графічныя арганізатары, якія прапаноўвае тэхналогія развіцця крытычнага мыслення, садзейнічаюць развіццю праблемнага, творчага мыслення, камунікатыўных навыкаў вучняў, глыбокаму разуменню імі вывучаемага матэрыялу; стымулююць візуальнае адлюстраванне вучнямі ўласнага бачання ўспрымаемай імі інфармацыі, а таксама, «у адрозненні ад традыцыйнай педагогікі, тэхналогія развіцця крытычнага мыслення дапамагае вучням самастойна вызначаць накірункі ў вывучаемай тэме, самастойна рашаць праблемы, г.зн. мысліць» [1].

М. Э. Дулама ў сваім артыкуле «Развитие критического мышления посредством использования таблиц» прыводзіць шырокі пералік разнавіднасцей табліц: табліца аргументаў і контраргументаў, табліца прагнозаў, вынікаў, параўнальная табліца, табліца паняццяў, прымет, дадзеных і г. д., якія могуць выкарыстоўвацца пры вывучэнні розных дысцыплін [2].

Прыём «Зводная табліца», часам параўнальная табліца, мае на мэце правесці паралелі паміж вывучаемымі з'явамі, вызначыць іх падабенства і адрозненне, а таксама сістэматызаваць інфармацыю. Сярэдняя калонка табліцы называецца «Лініі параўнання», ёй звычайна пералічваюцца тыя катэгорыі, па якіх адбудзецца параўнанне фактаў, з'яў. У калонкі, якія размяшчаюцца па абодва бакі ад «Лініі параўнання», заносіцца інфармацыя, якую неабходна будзе параўнаць [3, с. 133].

Інфармацыю для запаўнення табліцы вучні бяруць з падручніка, або абапіраюцца на раней атрыманыя веды. Пры гэтым лініі параўнання могуць быць вызначаны самімі вучнямі. Як мяркуюць распрацоўшчыкі названага прыёма, ліній параўнання павінна быць не болей шасці, паколькі такую колькасць паралелей лягчэй утрымліваць у памяці. Разам з тым, лініі параўнання можна выбіраць калектыўна: усе прапанаваныя вучнямі варыянты запісваюцца на дошцы, а затым ідзе аргументаваны адбор 3—6 з усіх прапанаваных [3, с. 135].

На нашу думку, прыём «Зводная табліца» можа быць эфектыўна выкарыстаны пры вывучэнні пытанняў эмацыянальна-экспрэсіўнай лексікі на ўроках беларускай мовы ў школе. Так, у 6-м класе знаёмства з тэмай «Утварэнне эмацыянальна-ацэначных форм назоўнікаў і прыметнікаў» можна правесці, выкарыстоўваючы дадзены прыём. Прычым М. Э. Дулама, лічыць неабходным навучыць школьнікаў самастойна ствараць такія табліцы. Навучанне трэба арганізоўваць паэтапна. Па-першае, можна прапанаваць вучням табліцу з назвамі ліній параўнання і папрасіць запоўніць яе самастойна, а затым, абмеркаваўшы з таварышам, прыйсці да агульнага рашэння. Наступны крок — абмеркаванне ўсім класам, якую менавіта інфармацыю з тэксту патрэбна ўключыць у табліцу, і падвядзенне вучняў да стварэння агульнай табліцы — прадукта сумесных намаганняў класа. Як толькі табліца будзе гатова, вучні запаўняюць яе самастойна, выкарыстоўваючы прыём «Падзяліся з таварышам». І ўрэшце настаўнік дае заданне, якое патрабуе ад вучняў аналізу высокага парадку, для чаго ім прапануецца сканструяваць табліцу, якая будзе таму садзейнічаць.

Вынікам такой працы могуць стаць табліцы 1—2.

Як бачым, атрымаліся табліцы з трыма і чатырма лініямі параўнання. Пры гэтым табліцы могуць быць дапоўнены і іншымі фактамі, кожны вучань мае права павялічыць колькасць ліній параўнання.

Эфектыўнасць такога прыёма заключаецца ў тым, што ствараецца магчымасць не проста засвоіць асноўныя палажэнні тэмы, але і суаднесці, параўнаць пэўныя факты з розных тэм, вылучыць іх падабенства і адрозненне. Увесь матэрыял наглядна ўспрымаецца вучнямі, што, безумоўна, будзе садзейнічаць актывізацыі іх пазнавальнай дзейнасці і лепшаму засваенню матэрыялу.

Т а б л і ц а 1 — Параўнанне назоўніка і прыметніка

| Назоўнік | Лініі параўнання | Прыметнік |
|---|---|---|
| -к-; -ік-; -іц-; -ейк-; -ечк-; -ак- і інш. | памяншальна-ласкальнае значэнне | -еньк-; -аньк-; -эньк-; -утк-; -ютк- і інш. |
| -ішч-; -ыск-; -ын-; -ін-; -уг- і інш. | павелічальна-ўзмацняльнае значэнне | -ізн-; -озн-; -эзн-; -енн-; -энн-; -ізарн- і інш. |
| — | непаўната якасці | -ав-; -яв-; -ляв-; -ават-. |

Т а б л і ц а 2 — Параўнанне назоўніка і прыметніка

| Назоўнік | Лініі параўнання | Прыметнік |
|---|---|---|
| -к-; -ік-; -іц-; -ейк-; -ечк-; -ак- і інш. | памяншальна-ласкальнае значэнне | -еньк-; -аньк-; -эньк-; -утк-; -ютк- і інш. |
| -ішч-; -ыск-; -ын-; -ін-; -уг- і інш. | павелічальна-ўзмацняльнае значэнне | -ізн-; -озн-; -эзн-; -енн-; -энн-; -ізарн- і інш. |
| — | непаўната якасці | -ав-; -яв-; -ляв-; -ават-. |
| мастацкі, гутарковы стылі | сфера выкарыстання | гутарковы, мастацкі стылі |

## Спіс крыніц


1. *Булахова, З. Н.* Применение технологии развития критического мышления на уроках русского языка и литературы / З. Н. Булахова / Народная асвета. — 2004. — № 9. — С. 15—19
2. *Дулама, М. Э.* Развитие критического мышления посредством использования таблиц / М. Э. Дулама / Перемена. — 2005. — № 2. — С. 36—42.
3. *Загашев, И. О.* Учим детей мыслить критически / И. О. Загашев, С. И. Заир Бек, И. В. Муштавинская. — СПб. : Альянс Дэльта, 2003.